# Літоўская Метрыка

Літоўская Метрыка – скарочаная назва Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага, збора «сшыткаў і кніг» вялікакняжацкай канцылярыі XV–XVIII стагоддзяў, з копіямі дакументаў, што выдаваліся ад імя вялікага князя (гаспадара), паноў-рады і соймаў. Дакументы падлягалі захаванню, неабмежаванаму ў часе. У складзе Метрыкі знаходзяцца агульназемскія і абласныя прывілеі, прывілеі гарадам і асобным групам насельніцтва, прывілеі на валоданне маёнткамі і розныя фінансавыя льготы. Значнае месца займаюць судовыя дэкрэты, што разглядаліся вялікакняжацкім судом. У пасольскіх кнігах змешчаны матэрыялы знешняй палітыкі – дагаворы, інструкцыі паслам, перапіска з іншымі дзяржавамі і інш.

Метрыка стала асновай вялікакняжацкага, а пазней галоўнага дзяржаўнага архіва і выконвала юрыдычна-рэгістрацыйныя функцыі. На аснове матэрыялаў Метрыкі паводле адпаведных запытаў выдаваліся юрыдычна завераныя дакументы (копіі з копій). Асноўная частка дакументаў ад XV да пачатку XVII стагоддзя складзена на беларускай мове, а пазней на польскай і лацінскай мовах.

Сшыткі і кнігі Метрыкі вяліся з сярэдзіны XV да пачатку XVI стагоддзя. Яны зберагаліся ў Троцкім замку пад наглядам гаспадарскага падскарбія, пазней захоўваліся ў вялікакняжацкім скарбе ў Вільні. Загадваў кнігамі Метрыкі канцлер, а з 1566 года падканцлер Вялікага Княства Літоўскага. Пасля размежавання канцылярый канцлера і падканцлера Метрыка падзялілася на вялікую і меншую. Частае выкарыстанне дакументаў ужо да канца XVI стагоддзя значна папсавала іх. Пад кіраўніцтвам канцлера Льва Сапегі ў 1594–1607 гадах старыя кнігі былі перапісаны, але ў XVII стагоддзі яны амаль усе загінулі (падчас вайны Рэчы Паспалітай з Расіяй 1654–1667 гадоў. – *«КГ»*). Новыя кнігі разам з пазнейшымі кнігамі выкарыстоўваліся ў гаспадарскай канцылярыі ў XVII–XVIII стагоддзях, яны і склалі аснову сучасных фондаў Метрыкі. Да сярэдзіны XVIII стагоддзя архіў ВКЛ быў перавезены ў Варшаву, а пасля задушэння паўстання 1794 года – у Санкт-Пецярбург, і большая яго частка перададзена ў Сенат Расійскай імперыі. У 1887–1888 гадах матэрыялы Метрыкі былі пераведзены ў маскоўскі архіў Міністэрства юстыцыі і цяпер захоўваюцца ў Расійскім дзяржаўным архіве старажытных актаў у Маскве (фонд 389, 662 адзінкі). У Нацыянальным гістарычным архіве Беларусі ёсць іх мікракопіі. Некаторыя дакументы са складу Метрыкі цяпер захоўваюцца ў Галоўным архіве старажытных актаў у Варшаве, Расійскай Нацыянальнай бібліятэцы ў Санкт-Пецярбургу, Нацыянальнай бібліятэцы Украіны імя У.І. Вернандскага ў Кіеве і некаторых іншых зборах.

Дакументамі Метрыкі карысталіся і карыстаюцца для сваіх працаў гісторыкі пачынаючы з XIX стагоддзя. Шмат матэрыялаў з яе апублікавана ў розных зборах дакументаў XIX–XX стагоддзяў. Шматтомная публікацыя Метрыкі Вялікага Княства Літоўскага ажыццяўляецца з 1987 года археографамі Польшчы, а з 2000 года археографамі Інстытута гісторыі НАН Беларусі. За апошнія гады апублікаваны і матэрыялы Метрыкі ў Літве ў перакладзе на літоўскую мову (дакументы Метрыкі на літоўскай мове не вяліся).

***Анатоль ГРЫЦКЕВІЧ,***
***прафесар***



STANISLAUS AUGUSTUS REX
HAEC
MAGNI DUCATUS LITVANIÆ
ACTA PUBLICA
VICISSITUDINE TEMPORUM
DISPERSA COLLIGI
LACERA INNOVARI
CORROSA TRANSCRIBI
ATQUE EX LOCO SQUALLIDO
IN CONCLAVI ÆDIUM REIPUBLICÆ COLLOCARI
PROVIDENTIA AC MUNIFICENTIA SUA
FECIT
A. D. MDCCLXXXVI.

CANCELLARIATU
ALEXANDRI PRINCIPIS SAPIEHA
PROCANCELLARIATU
JOACHIMI COMITIS CHREPTOWICZ
CURA & LABORE
ADAMI NARUSZEWICZ
MAGNI DUCATUS LITVANIÆ NOTARII

*Друкаваны тытульны аркуш 1786 г. кнігі 562 з дакументамі 1549 г.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ